*Вікторыя Драпала*

# МАЛАВЯДОМЫЯ ЗАПІСЫ ПЕСЕННАГА ФАЛЬКЛОРУ ПІНШЧЫНЫ: З ПАЛЯВЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ РУКАПІСАНАГА АРХІВА ЯЗЭПА ДРАЗДОВІЧА

Язэп Драздовіч – асоба унікальнага лёсу. Align Living Празнабакова адораны мастак і выкладчык малявання, актыўны руплівец захавання культурнай спадчыны беларусаў і паэт, літаратар і астраном-дылетант, ён вельмі шмат займаўся яшчэ і збіраннем этнаграфічных матэрыялаў, песень і вуснай прозы для заснаванага І. Луцэвічам ў 1921 годзе музея ў Вільні. Як і ўся творчасць Драздовіча, гэты яе бок прыцягнуў увагу даследчыкаў толькі пасля смерці мастака, у сярэдзіне XX стагоддзя. Пры жыцці Драздовіча яго дзейнасць ні ў прэсе, ні ў навукова-тэарэтычных і папулярызатарскіх мастацтвазнаўчых аглядах не асвятлялася. Галоўную ролю адыгрывала неразуменне тэматыкі яго твораў, іх скіраванасці ў неймаверныя далячыні космасу нябеснага і зямнога. Як і драздовіцкая тэорыя нябесных рухаў («Нябесныя бегі»), яго пісьменніцкі і збіральніцкі плён заўважанымі не былі. Гэтаксама амаль усё жыццё Драздовіча суправаджала непрыняцце яго з боку калег-мастакоў. Жыццё прайшло ў глыбокай беднасці. Заробак (а часцей толькі абяцанкі яго) толькі часовай працай змушаў берагчы кожны рубель, такі неабходны для набыцця фарбаў, паперы, пэндзаляў, не кажучы ўжо пра ежу, адзенне, боты. Толькі з канца 1950-х гадоў сталі вядомымі як драматычныя падзеі жыцця мастака, так і яго спадчына – карціны, літаратурныя творы, запісы ўзораў беларускага фальклору, якія пачалі асэнсоўвацца на ўзроўні нацыянальнага здабытку і высокіх помнікаў усёй беларускай культуры.

Адным з першых, хто годна раскрыў постаць Я. Драздовіча, стаў А. Ліс, які на працягу амаль 20 гадоў ладзіў экспедыцыі па месцах яго вандроўнага жыцця мастака, шукаў людзей, якія былі з ім знаёмыя, памяталі яго як чалавека («дзядзьку Язэпа»), распавядалі пра яго дзейнасць як збіральніка песень і пра тыя маляванкі, якія ён звычайна «дарыў» вяскоўцам за сталаванне. Матэрыялы, сабраныя А. Лісам, не толькі раскрылі розныя бакі жыцця Я. Драздовіча [3], але і ўпершыню акцэнтавалі фалькларыстычную дзейнасць мастака.

З існуючых сёння ў нашай краіне больш-менш даступных крыніц вывучэння фалькларыстычнай дзейнасці Я. Драздовіча самым рэпрэзентатыўным з'яўляецца архіў у бібліятэцы імя Я. Коласа Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, дзе захоўваецца рукапісны фонд Драздовіча. Сярод іншых месцаў захавання рукапісных матэрыялаў мастака – фонд беларускага фалькларыстычнага архіва ў Літоўскім інстытуце літаратуры і фальклору, на які ўпершыню звярнула ўвагу В. Лабачэўская [2].

Архіў Драздовіча ў Акадэміі навук (кадыфікаваны як фонд № 2, вопіс № 1 «Дроздович Иосиф Нарцисович») быў набыты ў 1965 г. ад адной з сясцёр мастака. Апісаны Я. М. Кісялёвай у верасні 1975 г., дапоўнены ў 1983 г., ён захоўваецца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў. Колькасць адзінак, пададзеных у архіве, – 79. Яны тэматычна сістэматызаваны, акуратна падшыты і размеркаваны па папках наступным чынам:

1. Творчыя матэрыялы Я. Драздовіча (малюнкі, эскізы, накіды, артыкулы, вершы, паэмы, аповесці, фальклорныя матэрыялы) за 1915-1952 гг.

2. Дзённікі і дзённікавыя запісы (з 1933 па 1937 г.)

3. Ліставанне Драздовіча з рознымі асобамі і арганізацыямі, лісты сям'і Драздовічаў (1907-1953)

4. Фотаздымкі і іншыя іллюстрацыйныя матэрыялы за 1907-1951 гг.

5. Матэрыялы біяграфічнага і асабістага характару (генеалагічная табліца роду Драздовічаў, пастанова аб прызнанні роду Драздовічаў дваранскім) (1845, 1890-1943)

6. Матэрыялы пра Я. Н. Драздовіча (1925, 1952)

7. Матэрыялы родных фондаўтваральніка і іншых асоб (1798-1941)

Мне пашчасціла патрымаць у руках сшыткі і паперы, якія калісьці належалі гэтаму вялікаму чалавеку, убачыць зашмальцаваныя, пацямнелыя ад часу, абгрызеныя мышамі старонкі з размашыстым і шырокім графічным почыркам, які выдае характар творчай натуры мастака. Ужо пры першых праглядах здзівіла каліграфічная прамалёўка асобных літар з старанна, рэльефна і акуратна выведзенымі завіткамі.

Матэрыял архіўнага фонду Драздовіча адлюстроўвае розныя сферы яго творчасці: літаратурныя творы (апавяданні, раманы, вершы), навуковыя артыкулы (рукапісы, дзе выкладзены наватарскія тэорыі мастака ў галіне астраноміі), ліставанне з многімі значнымі асобамі яго часу – Максімам Танкам, Вацлавам Ластоўскім, Браніславам Эпімах-Шыпілам, Рыгорам Шырмам, Антонам Луцкевічам, сябрамі (у ліку самых блізкіх - фальклярыст А. Грыневіч і мастак П. Сергіевіч), з рэдакцыямі (лісты 1911–1929 гг.) «Нашай нівы» і «Дзянніцы», з якімі Драздовіч супрацоўнічаў

Фальклярыстычныя матэрыялы (адзінкі захоўвання 23-30) пададзены ў фондах архіва НАН пад нумарамі. У іх ліку архіваваныя ў рускай, часткова ў беларускай мове «Народные песни, собранные Дроздовичем на Пинщине, Дисенщине и в других местностях» (148 с.), «Афоризмы» (1 с.), «Пословицы и поговорки» (45 с.), «Народныя прыказкі Дзісеншчыны» (47 с.), «Лингвистические материалы (говоры Дисенщины и Пинщины)» (88 с.), дзе пададзены запісы тэкстаў вясельных песень і іншых жанраў. Вялікую цікавасць маюць «Беларуска-расейская тэрміналёгія па анатоміі і фізіялёгіі цела чалавека» (словарь) (70 с.) і «Слоўнікавы матэрыял з Дзісеншчыны» (172 с.). Агульная колькасць тэкстаў захоўвання - 571 рукапісная старонка.

Для даследчыка-музыколага важна, што фальклярыстычная дзейнасць мастака супала з эпохай, якая спрыяла абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці, увагі да роднай мовы і ўсяго «беларускага». Сімптаматычнай з’явай у гэты час найвышэйшага ўздыму творчых сіл беларускай культуры было тое, што вельмі многія дзеячы мастацтва імкнуліся захаваць для нашчадкаў культурную спадчыну сваёй Радзімы. У ліку акцый - арганізацыя шэрагу фальклярыстычных экспедыцый (А. Грыневіч, М. Аладаў, П. Бузук, Я. Лёсік, М. Гарэцкі, крыху пазней Р. Шырма), стварэнне этнаграфічных музеяў (адзін з іх арганізаваны ў Вільні на базе этнаграфічнай і археалагічнай прыватнай калекцыі І. Луцкевіча). Я. Драздовіч, які ў 1920-30-я гады пачаў збіраць свой матэрыял для гэтага музея, таксама свядома і аддана рупіўся пра захаванне аўтэнтычнага беларускага вуснатрадыцыйнага і этнаграфічнага матэрыялу. Ён збірае калекцыю аўтэнтычнага народнага адзення, галаўных убораў, робіць замалёўкі народнага дойлідства, прылад працы, прадметаў земляробчага побыту. Назапашанае ўтварае сапраўдную энцыклапедыю беларускай этнаграфіі, аналагаў якой да нашага часу цяжка адшукаць. Тое, што Драздовіч не абмінуў сваёй увагай і фальклор песенны (ім зафіксаваны багаты лінгвістычны матэрыял, а таксама мноства песенных тэкстаў, прыказак, прымавак, афарызмаў), сведчыць не толькі аб шырыні натуры мастака. Істотна, што падчас адной толькі камандзіроўкі ў 1926 годзе, якую ён здзейсніў па просьбе Антона Луцкевіча (брата І. Луцкевіча), Драздовіч занатаваў корпус тэкстаў усяго вясельнага абраду Пінскага Палесся. Больш таго, ён перапісаў палявыя запісы ў асобны альбом і (паводле інфармацыі А. Ліса [3]) адаслаў яго ў Акадэмію Навук БССР.

З водгукаў тых, хто ведаў Я. Драздовіча, а таксама па ўзроўню і ступені дакладнасці занатаваных ім узораў, зразумела, што мастак, хоць і не валодаў музычнай граматай, але музычны слых і памяць меў выдатныя. Здольнасці гэтыя, хутчэй за ўсё, перайшлі да яго ад маці. Вясковая жанчына, яна была цудоўнай спявачкай, ад якой у 1917 г. занатоўваў народныя песні А. Грыневіч. Драздовіч, калі ў 1920-я гг. жыў у Вільні, таксама шмат што наспеўваў Р. Шырме. Многія з тых уласных запісаў, якія Драздовіч паказаў Р. Шырме, былі ўключаны ў чатырохтомны збор «Беларускія народныя песні. У 4-х тамах. Запіс Р. Шырмы» (Мінск, 1959-1974).

Тонкасць музычнага слыху пры ўмове, што яго носьбіт не мае спецыяльнай музычнай адукацыі, але валодае выдатнай інтанацыйнай памяццю, з’ява нярэдкая сярод «не музыкантаў». Вядома, што багата музычна адоранымі былі М. Лужанін, М. Грынблат, Ул. Караткевіч, якія ведалі шмат народных песень, і ад якіх таксама рабіў свае запісы Р. Шырма. У дачыненні да Драздовіча вельмі важна тое, што ён пры фіксацыі нават вербальных радкоў песенных тэкстаў спрабаваў пазначыць і меладыйную лінію напеваў. Дзеля гэтага ім была распрацавана лічбавая натацыя, у якой кожнай ноце гукараду адпавядала свая лічба [*1].

Акрамя таго, у рукапісах Я. Драздовіча фігуруюць пазначэнні «*на струменце народная цытра*», «*з цытры*», што можа сведчыць аб выкарыстанні гукавога строю названага інструмента ў якасці асновы, з якой збіральнік суадносіў гукавышыннасць чутых ім песенных узораў.

У чарнавіках палявых матэрыялаў Я. Драздовіча запісы зроблены сінім алоўкам, тут шмат перакрэсліванняў, правак, пададзеных над радкамі паэтычнага тэксту. Калі-нікалі сустракаюцца фрагменты прозы (тэксты, запісаныя ў слупок, але не зрыфмаваныя), што стварае ўражанне фіксацыі іх не ў момант гучання, а пры ўзнаўленні і запісу песень па памяці.

Нататкі на палях, якія тлумачаць незнаёмыя словы, даюць удакладненне, або пераклад, або сінанімічныя варыянты тых ці іншых словаў. Усё гэта сведчыць аб разуменні Драздовічам важнасці кожнага з аспектаў фіксатарскай і транскрыптарскай працы. Навучаны сябрам, славутым і вопытным збіральнікам народных песень, Я. Драздовіч, як сапраўдны фальклярыст, паглыбляецца ў гаворкі тых мясцовасцей, дзе ён працуе, і дакладна фіксуе асаблівасці маўлення кожнай вёскі. У ліку фіксацый памякчэнне зычных *(зьбіраць, цьвіла, сьвякроўка, сьлёзы, шчасьце, трэцьці)* і галосных *(дзяўчынінька, ніпускаець, нябуду, ніразлівай)*, асаблівасці канчаткаў на -іць, -ець, -аць *(кукуець, гукаець, шчабечаць, будзець, нісагрэіць, лётаіць)*, цвёрдыя галосныя *(мэнэ, нэма, тэчэ, маты, погоныць, дэнь, людэй, мылэнькі, дэцючок)* і, нарэшце, палескае «саканне» *(не вернуса, трасліса, абняўшыса, несогнуса, нескрыўлюса, повалыўса*). Гэтаксама дакладна выпісвае Драздовіч характэрныя для пінскай часткі палескіх гаворак дыфтонгі, найперш -оу *(постоуй).*

Самастойны кірунак у рукапісных матэрыялах Драздовіча складае спроба збіральніка сфарміраваць слоўнік гаворак вёсак з розных частак Піншчыны. Прынцып арганізацыі абапіраецца на падзел лінгвістычнага масіву на асобныя тэматычныя блокі, якія адпавядаюць назвам жывёлаў, птушак, раслін, частак чалавечага цела і інш. з фіксацыяй тых памяншальных слоўных формаў, якія найбольш ужывальныя ў вясковым маўленні пінчукоў *(кацяняты – кацюкі; савяняты – савукі, вожычак – ежык; ласі – лысюкі, зайцы – зайчукі і г. д.).*

Паэтычныя песенныя тэксты, зафіксаваныя Драздовічам, таксама маюць дакладную рубрыкацыю. Прынамсі, побач з тэкстам мастак адзначае жанравую (калі дакладней, функцыянальную) прыналежнасць таго ці іншага напеву - жніво, купалле, вяселле і інш. Разам з поўным указаннем жанру ў рукапісах на палях сшыткаў пазначаны асобныя літары *(в, л, т, б, к, г)*, а таксама лічбы, якія, магчыма, выстаўляліся збіральнікам з мэтай падлічыць агульную колькасць запісаў таго ці іншага жанру. Асабліваць гэтая ў асноўным тычыцца вясельных тэкстаў (іх каля 200). Іх Я. Драздовіч падзяляе на групы у залежнасці ад прыналежнасці да пэўных частак абраду. Зыходзячы з тлумачэнняў і звестак, якія збіральнік непасрэдна атрымаў ад інфармантаў, ён вызначае ў Пінскім вяселлі такія групы тэкстаў, як: *на заручынах, перазыў (перэзоў, перозыўкі), выпраўная, ад шлюбу, як до дзіўкі зьбераецца, як едзе маладзенец да маладухі (як заедзець да дзеўкі), каравай,*

*кубельніцка, да шлюбу, як дарыць, як вязе маладзенец маладуху да сябе, у Сьвякрыўкі, у сьвёкра* і інш.).

Пры тым што ў коле матэрыялаў, сабраных Я. Драздовічам, прыярытэт належыць вяселлю (*вясельная, вэсыльле*), у іх шырока пададзены і каляндарна-абрадавыя жанры. Тыя назвы, якія фіксуюцца збіральнікам як *калядная, весэнная (вcase), веснiная, весьненая), велікодная, тройцавая, траецкая, купальская, жніўная, осеньняя,* не толькі захоўваюць адметнасці вясковай гаворкі, але і надзіва дакладна раскрываюць вядомую па сучасных экспедыцыйна-палявых даследаваннях будову каляндарна-земляробчага песеннага цыкла Піншчыны. Не менш старанна фіксуе Драздовіч песні пазаабрадавага зместу, якія пазначае: *гістарычная,* гумарыстычная *(гумар.), удавіная,* песні замужніц (*замуж.), старынная* вайсковая *(вайск.), камічная, рэкруцкая, прыпеўкі, дзецячыя.* Прыцягваюць увагу такія характарыстыкі, як *не тутэйшая* або звязаная з выкананнем абы-калі *простая заўсягдашняя*.

Я. Драздовіч усведамляў, якая важная для раскрыцця народнай песні інфармацыя аб тым, хто з’яўляецца яе носьбітам, які яго пол, узрост і да т. п. Таму дакладна зафіксаванымі апынаюцца звесткі аб кожным інфарматары, месцы яго жыхарства, паходжанні, часам нават і ўзросце: «*Запісана ад грамадзянкі вёскі Прапелеўшчына Кастусі Ледаховіч, родам з Куноўскіх*»; «*Запісаныя ад Анэты Малькевічанкі*»; «*Зоня Шоломіцкая, Васіль Шоломіцкі 65 л.*» Наўрад ці трапілі Драздовічу ў яго экспедыцыях такія зоркі, як шырмавая Захвея Хвораст, але аб’ём і жанравая разнастайнасць таго, што было праспявана спевакамі, з якімі збіральнік кантактаваў, сведчыць аб галоўным: значнасці і захаванасці спеўнай традыцыі Пінскага Палесся ў розных яе гістарычных стылях.

Архіў сведчыць, што падарожжы Драздовіча па Піншчыне ахоплівалі вёскі, многія з якіх ужо не існуюць на мапе. Няма Субарніцы, Падгацця, Дубчыц, Мал. Марочын, мястэчак Сернікі, Зарэчча. Засталіся Азарычы, Крыўчычы (цяпер Крыўчыцы), Дубнавічы, Лозічы (у Драздовіча сустракаем як Лозічы, так і Лознічы), Парэчча, Велясьніца або Вялесьніца. У рукапісах, акрамя таго, пададзены запісы з-пад Вільні, з поўдня Беларусі: з Ашмяншчыны, Галубіччыны, Дзісеншчыны («над Ауцьця» – мясцовасці з радзімы мастака паміж рэкамі Мнютай і Аўтай), Лепельшчыны.

Драздовічавыя рукапісныя матэрыялы адлюстроўваюць безумоўна значную ступень падрыхтаванасці мастака да збіральніцкай дзейнасці і плённае выкарыстанне навыкаў, перанятых ад сябра А. Грыневіча і іншых нашаніўцаў, якія валодалі асновамі фалькларыстычнай працы на належным узроўні. Талент Я. Драздовіча дазволіў яму хутка, арганічна і цэласна засвоіць і выкарыстаць у сваёй збіральніцкай і транскрыптарскай рабоце тое, што патрабуе спецыяльнай фалькларыстычна-музыказнаўчай адукацыі.

Унёсак Я. Драздовіча ў раскрыццё вуснатрадыцыйнай культуры беларусаў раскрываецца ў яго сапраўдным маштабе на фоне тых збораў, якія атрымалі выданне ў апошняй трэці XX ст. і ахапілі рэгіянальныя традыцыі Беларускага Палесся (у тым ліку Піншчыны), Паазер’я, Панямоння, Падняпроўя.

Не выпадкова і тое, што ў наш час, у пачатку XXI стагоддзя, выдатная постаць мастака па-ранейшаму ў цэнтры ўвагі. Ладзяцца канферэнцыі з мэтай даследавання яго творчасці і рознабаковай дзейнасці, выдаюцца зборнікі матэрыялаў гэтых канферэнцый [5; 6], адкрываюцца невядомыя старонкі жыцця. Той факт, што фалькларыстычная дзейнасць Драздовіча пакуль не атрымала шырокага рэзанансу ў навуковым і грамадскім асяроддзі і што назапашанае ім застаецца раскіданым па рукапісах архіўнага захоўвання, ставіць пытанне як мага больш удумлівага раскрыцця сабраных даследчыкам матэрыялаў, бо за імі – беларускі народ, пра які Р. Шырма казаў, што ён «здолеў у песнях захаваць глыбінную нацыянальную свядомасць» [1, *126*].

## ЗАЎВАГІ

*1. Гэта пытанне патрабуе асобнага вывучэння. Дзеля фіксацыі напеваў, мастак распрацаваў сваю, даволі рэдкую музычная натацыю, аналагаў якой няма. Кожнаму гуку дыятанічнага гукарада ў аб’ёме дзвюх актаў (ад соль да фа) надавалася лічба ад 4 да 17. Так выглядае радок песні ў натацыі Я. Драздовіча:

**А за лі-хі-мі за ма-ро-за-мі**

*7 7 10 7 7 8 10 7 12 10*

Адным з недахопаў такой натацыі з’яўляецца тое, што яна не дае магчымасці рытмавай фіксацыі напеву, а таксама не прадугледжвае адзначэнне храматычных гукаў гукараду. Але Драздовіч, як сапраўдная творчая натура, знайшоў выйсце: некаторыя гукі ў сваёй натацыі ён пазначае праз дроб (напр. 8/7, 8/9), што, верагодна, указвае на паступовы храматычны нісходзячы/узыходзячы рух.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Варфоломеева, Т.* Григорий Ширма / Т. Варфоломеева // Белорусская этномузыкология: очерки истории (XIX-XX вв.). Мінск, 1997.

2. *Лабачэўская, В.* Фалькларыстычны архіў Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні: вяртанне праз 65 гадоў. // В. Лабачэўская // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманння: матэрыялы III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 29-30 красавіка 2009 г./ БДУКМ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2009.

3. *Ліс, А. С.* Вечны вандроўнік / А. С. Ліс. Мінск, 1984.

4. *Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. Мінск, 1997.

5. Язэп Драздовіч – асоба, творчасць: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 20-22 мая 1993 г. / БелІПК; уклад. В. Лабачэўская. Мінск, 1997.

6. Язэп Драздовіч: «Прыйдзе час…»: да 120-годдзя з дня нараджэння мастака: зб. навук. арт. / рэд. М. Цыбульскі. Смаленск, 2008.